# ПРАМЕЖКАВАЯ СПРАВАЗДАЧА № 2
## 25 лістапада – 5 снежня 2010 г.

**10 снежня 2010 г.**

## I. РЭЗЮМЭ

- Выбарчая кампанія набрала абароты пры скупых прыкметах перадвыбарнай дзейнасці па ўсёй краіне. Кандыдаты бесперашкодна праводзілі перадвыбарныя мерапрыемствы ў Мінску і рэгіёнах. Цэнтральная выбарчая камісія (ЦВК) прыняла рашэнне вынесці двум кандыдатам папярэджанне за арганізацыю несанкцыянаванага мітынгу ў Мінску.

- Падрыхтоўка да выбараў ідзе поўным ходам і праводзіцца ў вызначаны законам тэрмін. Участковыя выбарчыя камісіі (УВК) вывесілі спісы выбаршчыкаў для азнаямлення. ЦВК замовіла друк 7 447 000 бюлетэняў для прыблізна 7 094 000 выбаршчыкаў. На трэнінгах для членаў УВК працэдуры падліку галасоў час ад часу тлумачацца ў недастатковай меры.

- На адкрытым паседжанні з удзелам сродкаў масавай інфармацыі ЦВК, у склад якой уваходзілі вылучаныя кандыдатамі члены з дарадчым голасам, прыняла пастанову, што дазваляе галасаваць некаторым грамадзянам, якія знаходзяцца пад арыштам, а таксама прадугледзела дадатковыя меры бяспекі пры датэрміновым галасаванні.

- Усім кандыдатам былі выдзеленыя дзяржаўныя сродкі на правядзенне выбарчай кампаніі. ЦВК апублікавала інфармацыю аб унёсках у выбарчыя фонды кандыдатаў. Значныя грашовыя сродкі паступілі ў фонды толькі двух кандыдатаў.

- Дэбаты, якія прайшлі паміж кандыдатамі 4 і 5 снежня, трансляваліся ў прамым эфіры дзяржаўных тэлебачання і радыё. Дзейсны Прэзідэнт не прыняў удзел у дэбатах. Дзяржаўныя медыі выканалі прадпісанае законам абавязацельства даць кандыдатам бясплатны эфірны час на прадстаўленне сваіх праграм. Тэрмін для прадастаўлення бясплатнага эфірага часу мінуў 3 снежня.

- Папярэдныя вынікі маніторыгу СМІ Місіяй АБСЕ/БДІПЧ па назіранні за выбарамі (МНВ), сведчаць пра тое, што агульнанацыянальныя дзяржаўныя тэлеканалы не падавалі ў навінах і інфармацыйных праграмах збалансаваную інфармацыю пра дзейнасць усіх кандыдатаў і іх перадвыбарныя праграмы. У пераважнай большасці выпадкаў у навінах інфармуецца пра дзейнасць Прэзідэнта, ў той час як іншыя кандыдаты атрымалі нязначнае асвятленне ў навінах.

- Пяць кандыдатаў заявілі, што сутыкнуліся з цяжкасцямі пры друку агітацыйных матэрыялаў. Некаторыя друкарні не жадалі прымаць замовы ад кандыдатаў меркавана праз ціск з боку службаў дзяржбяспекі.

- Скаргі, накіраваныя ў УВК і Тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі (ТВК), разглядаюцца пераважна асобнымі членамі камісіі. Заканадаўства не рэгламентуе дакладную працэдуру разгляду скаргаў ніжэйшымі выбарчымі камісіямі. Зрэдку, паводле рашэння старшыні, скаргі разглядаюцца на паседжаннях ці трыма членамі камісіі.

## II. УМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ ПЕРАДВЫБАРНАЙ КАМПАНІІ

Выбарчая кампанія набрала абароты пры скупых прыкметах перадвыбарнай дзейнасці па ўсёй краіне. Восем з дзевяці апазіцыйных кандыдатаў бесперашкодна арганізавалі сустрэчы і мітынгі ў Мінску і рэгіёнах.[1] ЦВК вынесла папярэджанне двум кандыдатам [2] за правядзенне несанкцыянаванага мітынгу 24 лістапада на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску. Асноўныя пытанні, якія закранаюцца падчас выбарчай кампаніі, ўключаюць рэформу выбарчага заканадаўства, паляпшэнне ў адносінах з Расійскай Федэрацыяй, паскораную інтэграцыю з Еўрапейскім Саюзам, а таксама рэформу аховы здароўя і пенсійнай сістэмы.

Афіцыйная дзейнасць Прэзідэнта па-ранейшаму заўважная ў значнай ступені. У той час як на рэкламных шчытах і плакатах дзейсны Прэзідэнт не фігуруе, па Мінску, Брэсту і Гомелю размешчаныя шматлікія плакаты са слоганам «Разам мы Беларусь», што з'яўляецца адным з ключавых лозунгаў перадвыбарнай праграмы Прэзідэнта Лукашэнкі.[3]

Усе апазіцыйныя кандыдаты выказалі падобную занепакоенасць працэсам датэрміновага галасавання, падлікам галасоў, складам выбарчых камісій, абмежаваным і няроўным доступам да дзяржаўных медыя, злоўжываннем адміністратыўным рэсурсам. У той час як кандыдаты нядаўна адзначалі пэўныя паляпшэнні ўмоваў правядзення перадвыбарнай кампаніі, яны па-ранейшаму не вераць у магчымасць правядзення дэмакратычных выбараў.

Некаторыя кандыдаты паскардзіліся на непрыдатнасць некаторых месцаў для сустрэч кандыдатаў з выбаршчыкамі і, як вынік, абскардзілі рашэнні мясцовых выканаўчых камітэтаў. Большасць скаргаў была задаволеная, і кандыдатам былі прапанаваныя іншыя месцы. У некаторых рэгіёнах мясцовыя ўлады[4] павялічылі колькасць месцаў, прызначаных для распаўсюджвання агітацыйных матэрыялаў, а таксама колькасць адкрытых месцаў і памяшканняў для сустрэч кандыдатаў з выбаршчыкамі.

Пяць кандыдатаў[5] паведамілі, што сутыкнуліся з праблемамі пры друку агітацыйных матэрыялаў. Некаторыя друкарні не жадалі прымаць замовы меркавана праз ціск з боку службаў дзяржбяспекі. Іншыя друкарні марудна выконвалі замовы.

Усім кандыдатам былі выдзеленыя дзяржаўныя сродкі ў памеры 80,5 млн бел. руб. (каля 19 500 еўра). ЦВК апублікавала інфармацыю аб унёсках у выбарчыя фонды кандыдатаў.[6] Акрамя Уладзіміра Някляева і Андрэя Саннікава, ніхто з кандыдатаў не атрымаў значных унёскаў у свае фонды. На 30 лістапада чатыры кандыдаты не атрымалі ніякіх ўнёскаў.

## III. ВЫБАРЧЫЯ КАМІСІІ

Падрыхтоўка да выбараў ідзе поўным ходам і праводзіцца ў вызначаны законам тэрмін.

ЦВК аднагалосна прыняла некаторыя рашэнні, звязаныя з парадкам арганізацыі дзеянняў у дзень выбараў. ЦВК вызначыла спіс неабходных для галасавання дакументаў, якія пацвярджаюць асобу. Акрамя пашпарту, выбаршчыкі маюць права галасаваць па іншых дакументах з фатаграфіяй, такіх як ваенны білет, пасведчанне дзяржслужбоўцы, пенсійнае пасведчанне і студэнцкі білет. ЦВК дазволіла галасаваць некаторым грамадзянам, што знаходзяцца пад арыштам за дробныя і адміністратыўныя правапарушэнні. Яны будуць

---

1 За выключэннем кандыдата Віктара Цярэшчанкі.
2 В.Рымашэўскі і М.Статкевіч.
3 Газета *«Советская Белоруссия»* № 231 (23622) ад 2 снежня 2010 г.
4 Баранавічы, Брэст, Мазыр, Магілёў, паўднёвая і ўсходняя часткі Мінска.
5 Рыгор Кастусёў, Уладзімер Някляеў, Яраслаў Раманчук, Андрэй Саннікаў, Мікалай Статкевіч.
6 http://www.rec.gov.by/pdf/prb2010/inf2.pdf.

галасаваць у месцах утрымання пад арыштам пры дапамозе пераноснай скрыні ад адпаведнай УВК.

Папраўкі, ўнесеныя ў Выбарчы кодэкс ў 2010 годзе, прадугледжваюць шэраг мераў бяспекі, якіх неабходна трымацца на працягу пяці дзён датэрміновага галасавання. А менавіта: скрыні для галасавання павінны быць апячатаныя ўвечары напэрэдадні дня датэрміновага галасавання, назіральнікі маюць права прысутнічаць на штодзённых апячатванні і распячатванні скрыняў, пратакол з колькасцю падлічаных галасоў кожны дзень павінен вывешвацца для агляду на выбарчых участках і адлюстроўвацца ў выніковым пратаколе, а агульная колькасць выбаршчыкаў павінна быць прадстаўлена асобнай лічбай.

30 лістапада ЦВК вырашыла ўнесці дадатковыя меры для забеспячэння захаванасці выбарчых дакументаў цягам пяці дзён датэрміновага галасавання.[7] ЦВК распарадзілася, каб у перапынку паміж ранішнім і вечаровым галасаваннем скрыні былі апячатаныя, а выбарчыя дакументы, такія як невыкарастаныя бюлетэні і спіс выбаршчыкаў, захоўваліся ў апячатаным металічным сейфе. ЦВК, аднак, адмовілася дазволіць назіральнікам знаходзіцца на выбарчых участках уначы ў перыяд датэрміновага галасавання.

У адпаведнасці з Выбарчым кодэксам і згодна з Правіламі працэдуры ЦВК, акрэдытаваныя назіральнікі, СМІ, а таксама прадстаўнікі кандыдатаў прысутнічалі на паседжаннях ЦВК. 30 лістапада ўпершыню за гэтыя выбары прызначаныя кандыдатамі члены ЦВК з дарадчым голасам прысутнічалі на паседжанні ЦВК.[8]

Згодна з Выбарчым кодэксам, мясцовыя ўлады аказваюць выбарчым камісіям тэхнічную падтрымку, ў тым ліку забясечваюць іх абсталяваннем, неабходным у дзень галасавання. У двух выпадках (у Брэсцкай і Магілеўскай абласцях) мясцовая адміністрацыя адзначыла, што яна забяспечыць ЦВК пэўнай колькасцю празрыстых скрыняў для галасавання.

ЦВК замовіла Беларускаму дому друку выраб 7 447 000 бюлетэняў, у тым ліку максімум 5% рэзервовых бюлетэняў, якія будуць распаўсюджвацца па УВК.

З 3 снежня спісы выбаршчыкаў былі вывешаныя для азнаямлення ўсімі жадаючымі ў месцах размяшчэння УВК, што было пацверджана доўгатэрміновымі назіральнікамі ад АБСЕ/БДІПЧ**.** Выбаршчыкі маюць права праверыць свае дадзеныя ў спісе і папрасіць унесці папраўкі ці ўключыць іх у спіс. Уключэнне ў спіс выбаршчыкаў дазволена аж да заканчэння галасавання ў дзень выбараў пры наяўнасці дзейснага пашпарту.

На трэнінгах, якія праводзяцца для старшыняў УВК, іх памочнікаў і сакратароў, працэдуры падліку галасоў часам недастаткова тлумачацца.

## IV. СМІ

СМІ надавалі досыць абмежаваную ўвагу выбарчай кампаніі ўжо ад яе пачатку. СМІ, што вяшчаюць у Беларусі, пераважна асвятляюць працэдурныя і тэхнічныя аспекты выбарчага працэсу. ЦВК і іншыя афіцыйныя органы, ў тым ліку дзейсны Прэзідэнт, атрымалі значны аб'ём асвятлення ў СМІ, ў той час як асвятленне іншых кандыдатаў у навінах было вельмі абмежаваным.

Дэбаты паміж кандыдатамі трансляваліся ў прамым эфіры дзяржаўных тэлебачання і радыё 4 і 5 снежня адпаведна. Астатнія дзевяць кандыдатаў устрымаліся ад крытыкі адзін аднаго.

---

[7] Датэрміновае галасаванне будзе праходзіць з 14 па 18 снежня з 10:00 да 14:00 і з 16:00 да 19:00.

[8] Прадстаўнікі Някляева, Раманчука, Рымашэўскага, Саннікава і Статкевіча.

Замест гэтага яны засяродзіліся на прэзентацыі сваіх выбарчых праграмаў, раскрытыкавалі дзеянні ўлады і выказалі сваё меркаванне наконт існуючых у краіне праблемаў.

Дзяржаўныя СМІ выканалі прадпісанае ім законам абавязацельства даць кандыдатам бясплатны эфірны час на прэзентацыю сваіх выбарчых праграмаў. Апошні эфір быў выдзелены кандыдатам 3 снежня. Усе кандыдаты, акрамя дзейснага Прэзідэнта, выкарысталі бясплатны эфірны час для прадстаўлення сваіх выбарчых праграмаў у прамым эфіры дзяржаўных тэлебачання і радыё. Нягледзячы на вострую крытыку ўлады, ў тым ліку Прэзідэнта, яны не былі перапыненыя і не праходзілі папярэдняй цэнзуры. Выступы трансляваліся паводле графіку, сфармаванаму ў выніку жараб'ёўкі. Свае звароты кандыдаты маглі агучыць у прамым эфіры, але без выкарыстання відэазапісаў, песень і фотаздымкаў.

З 27 лістапада фінансуемыя дзяржавай газеты выдзелілі бясплатную плошчу для ўсіх кандыдатаў. Выбарчыя праграмы былі прадстаўленыя кандыдатамі ў рэдакцыі газет і папярэдне ўхваленыя рэдактарамі перад друкам. Праграма дзейснага Прэзідэнта была апублікаваная на першай старонцы, ў той час як праграмы астатніх кандыдатаў з'явіліся на ўнутраных старонках, што з'яўляецца парушэннем Выбарчага кодэксу[9], які гаворыць пра роўныя правы ўсіх кандыдатаў. На дадзены момант усе кандыдаты выкарысталі бясплатныя плошчы ў нацыянальных друкаваных выданнях.[10] У палітычных блоках навінаў і ў блоках навінаў, прысвечаных выбарам, дзяржаўныя газеты прадэманстравалі перадузятае стаўленне да кандыдатаў на карысць дзейснага Прэзідэнта.

Папярэднія вынікі маніторыгу СМІ Місіяй АБСЕ/БДІПЧ па назіранні за выбарамі (МНВ) сведчаць пра тое, што агульнанацыянальныя дзяржаўныя тэлеканалы не падавалі ў навінах і інфармацыйных перадачах сбалансаваную інфармацыю пра дзейнасць усіх кандыдатаў і іх перадвыбарныя праграмы. Навіны надавалі істотную ўвагу дзейнасці Прэзідэнта, часта паказваючы яго ў пазітыўным святле, ў той час як крытычныя меркаванні і каментарыі наконт ягоных дзеянняў, як правіла, адсутнічаюць. Іншыя кандыдаты, наадварот, атрымалі нязначнае асвятленне ў навінах, дзе іх часта прадстаўлялі як абязлічаную масу, не ўзгадваючы іх прозвішчаў.

Ад пачатку афіцыйнага старту выбарчай кампаніі[11] дзяржаўны Першы канал прысвяціў Прэзідэнту 86% навінаў, звязаных з палітыкай і выбарамі. Манера падавання інфармацыі была альбо пазітыўная, альбо нейтральная. Больш як у палове выпадкаў Прэзідэнт Лукашэнка меў магчымасць звяртацца да грамадзянаў непасрэдна. Для параўнання: ўсе астатнія кандыдаты атрымалі ў суме 14% асвятлення ў СМІ. Манера падавання інфармацыі пра іх была альбо відавочна негатыўная, альбо нейтральная. Дадзеныя, сабраныя па асвятленні на дзяржаўным радыё, адлюстроўваюць падобныя вынікі.

Дзяржаўныя тэлеканалы ОНТ і СТВ асвятлялі перадвыбарную кампанію аналагічным чынам (кожны канал прысвяціў 90% асвятлення Прэзідэнту Лукашэнку). У той час як манера асвятлення дзейнасці Прэзідэнта была альбо пазітыўная, альбо нейтральная, асвятленне дзейнасці іншых кандыдатаў было негатыўнае. ОНТ таксама ўключыў у навінныя праграмы аўтарскую праграму «Как есть» («Як ёсць»), якая дыскрэдытуе апазіцыйных кандыдатаў.

22 лістапада кандыдат Уладзімір Някляеў звярнуў увагу ЦВК на няроўнае і недастатковае асвятленне выбарчай кампаніі дзяржаўнымі СМІ і папрасіў ЦВК абавязаць сродкі масавай

9 Артыкул 46.2.
10 За выключэннем кандыдата Уса ў газеце «*Советская Белоруссия*».
11 Перыяд моніторынгу: 18 лістапада - 5 снежня.

інфармацыі скараціць інфармаванне пра дзейнасць Прэзідэнта. ЦВК запярэчыла гэтаму і зазначыла, што няма ніякіх падставаў, каб умешвацца ва ўнутраную палітыку СМІ і што на патрабаванне Прэзідэнта яму павінны прадстаўляць час, не прадугледжаны ў праграмах радыё і тэлебачання.[12]

## V. ЗВАРОТЫ І СКАРГІ

Згодна з ЦВК, на 3 снежня ў ЦВК падалі дзве скаргі, ў ТВК — 140 і 96 — у мясцовыя выканаўчыя камітэты. Большасць скаргаў у ТВК і мясцовыя выканаўчыя камітэты тычыцца складу УВК і ТВК, ходу кампаніі і акрэдытацыі назіральнікаў.

Доўгатэрміновыя назіральнікі ад МНВ АБСЕ/БДІПЧ праінфармавалі, што скаргі, заяўленыя ў УВК і ТВК, разглядаюцца пераважна асобнымі членамі камісій. Заканадаўства не прадугледжвае дакладную працэдуру па разглядзе скаргаў ніжэйшымі камісіямі. У рэдкіх выпадках, паводле рашэння старшыні, скаргі разглядаюцца на паседжаннях ці трыма членамі камісіі (старшынёй, намеснікам старшыні і сакратаром).

На дадзены момант непасрэдна ў ЦВК былі накіраваныя 124 скаргі. Большасць з іх тычыцца складу УВК і ТВК, фармавання ініцыятыўных груп, збору подпісаў, злоўжывання адміністратыўным рэсурсам, перадвыбарнай дзейнасці, ў тым ліку празмерныя абмежаванні пры вызначэнні месцаў для сустрэч з выбаршчыкамі, акрэдытацыі і дзейнасці мясцовых назіральнікаў. З 295 пытанняў, пастаўленых перад ЦВК, а менавіта 124 скаргаў, а таксама прапановаў і тлумачэнняў, на дадзены момант толькі дзве былі разгледжаныя калегіяльна.[13]

ЦВК не мае паўнамоцтваў разглядаць скаргі на рашэнні мясцовых выканаўчых камітэтаў, але ЦВК перыядычна садзейнічае змяненню рашэнняў мясцовых выканаўчых камітэтаў у працоўным парадку.[14] ЦВК дзейнічала непаслядоўна, адмаўляючыся разглядаць аналагічныя скаргі і спасылаючыся на недастатковыя для гэтага паўнамоцтвы.

Згодна з наяўнымі афіцыйнымі дакументамі, ЦВК, ТВК, УВК і мясцовыя выканаўчыя камітэты разглядалі звароты грамадзянаў у вызначаны законам трохдзённы тэрмін з моманту іх рэгістрацыі, а ў выпадках, якія патрабавалі дадатковага вывучэння, — у дзесяцідзённы тэрмін.

Акрамя таго, любая асоба, ў тым ліку замежныя грамадзяне і арганізацыі, мае права падаць зварот аб парушэнні выбарчага заканадаўства ў адзін з 156 органаў пракуратуры, што знаходзяцца па ўсёй краіне.

## VI. МЯСЦОВЫЯ І МІЖНАРОДНЫЯ НАЗІРАЛЬНІКІ

На 29 лістапада ЦВК зарэгістравала 9 587 назіральнікаў ад арганізацый грамадзянскай супольнасці і акрэдытавала 429 міжнародных назіральнікаў, у тым ліку10 назіральнікаў з

---

[12] Закон аб «Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь» № 3602-XII ад 21 лютага 1995 г., Артыкул 25.

[13] У першым выпадку гаворка ідзе пра тлумачэнне, што тычыцца паўнамоцтваў ЦВК тлумачыць пэўныя пункты Выбрачага кодэксу, а таксама правоў назіральнікаў, перагледжаных 5 лістапада (Пастанова ЦВК № 93). У другім выпадку тлумачыліся правы назіральнікаў па назіранні за бяспекай скрыняў для галасавання, якія ахоўваюць сілы правапарадку. Нягледзячы на тое, што хадайніцтва было адхіленае, ЦВК прыняла Пастанову, якая тлумачыць Параграф 4 Артыкула 53 Выбарчага кодэксу, які тычыцца забяспечання бяспекі скрыняў на перыяд датэрміновага галасавання.

[14] Шэраг скаргаў па рашэннях мясцовых выканаўчых камітэтаў, якія тычацца складу выбарчых камісіяў (напр. ліст ЦВК № 01-12/В-367 ад 4 кастрычніка 2010 г.) і месцаў для сустрэч з выбаршчыкамі (напр. Рашэнні аб Маладзечанскім, Барысаўскім і Слуцкім райвыканкамах), былі разгледжаныя пасля ўмяшання ЦВК.

Парламенцкай Асамблеі Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі і 6 прадстаўнікоў ад міжнародных інстытутаў па выбарах. Кожны зарэгістраваны кандыдат мае права прызначыць 30 уласных прадстаўнікоў па назіранні на любым з выбарчых участкаў. Назіральнікі, чые кандыдатуры вылучылі палітычныя партыі, будуць садзейнічаць ім у назіранні за працэсамі ў дзень выбараў.

## VII. ДЗЕЙНАСЦЬ АБСЕ/БДІПЧ

У перыяд справаздачы МНВ АБСЕ/БДІПЧ працягвае сваю звычайную працу, сустрэчы з прадстаўнікамі дзяржаўных органаў, кандыдатамі і іх даверанымі асобамі, а таксама з выбарчай адміністрацыяй, прадстаўнікамі судзебных органаў, прадстаўнікамі СМІ і грамадзянскай супольнасці, з прадстаўнікамі дыпламатычнай місіі ў Беларусі. Старшыня МНВ АБСЕ/БДІПЧ сустрэўся з дзевяццю кандыдатамі і кіраўнікамі выбарчай кампаніі дзейснага Прэзідэнта. Сорак доўгатэрміновых назіральнікаў, размешчаных па ўсёй краіне, працягваюць назіраць за падрыхтоўкай да выбараў і за перадвыбарнай кампаніяй у рэгіёнах, а таксама рыхтуюцца да прыбыцця прыблізна 330 кароткатэрміновых назіральнікаў на перыяд выбарчага тыдню.

---

Напр., рашэнні Маладзечынскай, Барысаўскай і Слуцкай Акружных выбарчых камісій былі перагледжаныя пасля ўмяшальніцтва ЦВК.